# РАДЗІМА АБДЫМАЕ СЫНОЎ-ГЕРОЯЎ


*Слаўся, Айчына ты наша свабодная!*

**Голас Радзімы**

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕКЦЫІ КАМІТЭТА ЗА ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ І РАЗВІЦЦЁ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ З СУАЙЧЫННІКАМІ

№ 67 (651) | Жнівень 1962 г. | Год выдання 8-ы


## УРАЧЫСТАЯ СУСТРЭЧА ГЕРОЯЎ КОСМАСУ Ў МАСКВЕ

18 жніўня сталіца нашай Радзімы Масква сустракала герояў космасу Андрыяна Нікалаева і Паўла Паповіча.

З букетамі кветак, з прывітальнымі лозунгамі сабраліся на аэрадроме прадстаўнікі працоўных сталіцы. Прысутнічаюць члены дыпламатычнага корпуса, шматлікія прадстаўнікі савецкай і замежнай прэсы.

Для сустрэчы герояў-касманаўтаў на Унукаўскі аэрадром прыбылі члены Прэзідыума ЦК КПСС, міністры, кіраўнікі партыйных, савецкіх і іншых грамадскіх арганізацый Масквы. Тут жа — сваякі герояў космасу.

Над Масквой, экскартуемы знішчальнікамі, паказваецца серабрысты паветраны карабель «ІЛ-18».

Пад гукі авіяцыйнага марша, пад апладысменты і звонкае «ўра» героі космасу Андрыян Нікалаеў і Павел Паповіч спускаюцца па трапу і накіроўваюцца да трыбуны.

Гучаць словы рапартаў. Іх слухае Масква, слухае ўся краіна, увесь свет. Прыняўшы рапарт, Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчоў віншуе касманаўтаў, абдымае іх па-бацькоўску, цалуе. Герояў горача вітаюць усе, хто знаходзіцца на трыбуне,— члены Прэзідыума ЦК КПСС, сваякі касманаўтаў. Героі космасу, М. С. Хрушчоў, члены Прэзідыума ЦК КПСС, бацькі герояў абыходзяць калоны прадстаўнікоў працоўных Масквы, вітаюць іх. Грыміць авацыя.

На сонцы паблісквае лакам вялікая, увітая кветкамі машына. У яе садзяцца Андрыян Нікалаеў і Павел Паповіч, маці Андрыяна — Ганна Аляксееўна, бацька і маці Паўла Паповіча — Раман Парфір'евіч і Феадосся Касьянаўна, Марыя — жонка Паўла. У другой машыне — члены Прэзідыума ЦК партыі.

Аўтамабілі адзін за адным пакідаюць аэрадром. Урачысты картэж накіроўваецца па трасе касмічных герояў — ад паветраных варот сталіцы да Ленінскага праспекта і далей на Красную плошчу, у трыццацікіламетровы шлях авацый, славы, самых сардэчных прывітанняў масквічоў.

Чарада машын уязджае на Ленінскі праспект сталіцы. Усюды партрэты А. Нікалаева і П. Паповіча, на транспарантах надпісы: «Слава героям», «Слава савецкаму народу — пакарыцелю космасу», «Слава доблесным савецкім касманаўтам», «Наперад, да перамогі камунізма».

Людзі скандзіруюць Ні-ка-ла-еву — слава! Па-по-ві-чу — слава! Партыі — слава!

Вось машыны праехалі Акцябрскую плошчу, выехалі на вуліцу Дзімітрава. Уперадзе ўжо відаць чырвоныя крамлёўскія зоркі. Быццам маякі, свяцілі яны касманаўтам на іх шляху да подзвіга, які прывёў у захапленне ўсё чалавецтва.

Красная плошча. Сюды ў дні вялікіх агульнанародных урачыстасцей прыходзяць масквічы. І сёння тут сабраліся дзесяткі тысяч працоўных сталіцы.

Член Прэзідыума ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС Ф. Р. Казлоў аб'яўляе адкрытым урачысты мітынг у гонар гістарычнага палёту герояў-касманаўтаў.

*МАСКВА. 18 жніўня 1962 года. Урачыстая сустрэча на Унукаўскім аэрадроме слаўных сыноў савецкага народа герояў-касманаўтаў маёра Андрыяна Рыгоравіча Нікалаева і падпалкоўніка Паўла Рамановіча Паповіча.*



## ДЛЯ СЛАВЫ АЙЧЫНЫ, ДЛЯ СЛАВЫ НАРОДА

### Прамова А. Р. Нікалаева

ТАВАРЫШЫ, суайчыннікі, сябры мае!

Дарагі Мікіта Сяргеевіч!

Я шчаслівы з гэтай вялікай трыбуны далажыць Камуністычнай партыі, Савецкаму ўраду, асабіста Вам, Мікіта Сяргеевіч, што ганаровае заданне Радзімы выканана — групавы палёт у космас паспяхова завершан.

Поспехі Савецкага Саюза ў космасе не выпадковыя. Яны з'яўляюцца вынікам гераічнай працы савецкага народа, кіруемага нашай роднай Камуністычнай партыяй. Я бязмерна ганаруся тым, што мне, простаму савецкаму чалавеку, выхаванцу ленінскай партыі, давялося разам з маім сябрам Паўлам Паповічам пракласці новыя сцежкі да зорак.

Мнагадзённы групавы палёт вакол Зямлі, выдатная работа ўсіх сістэм караблёў, надзейная сувязь, дакладны спуск на Зямлю — усё гэта яшчэ адно сведчанне таго, на што здольны наш народ, якіх вялікіх вышынь дасягнулі савецкая навука і тэхніка.

Касмічны карабель «Усход-3» знаходзіўся ў палёце амаль чацвёра сутак і зрабіў больш чым 64 абароты вакол зямнога шара. Карабель прайшоў шлях звыш 2 мільёнаў 600 тысяч кіламетраў, перавысіўшы амаль у 8 разоў адлегласць ад Зямлі да Месяца. У час палёту я вёў запісы ў бартавым журнале. Мне думаецца, што сабраныя навуковыя даныя будуць мець вялікае значэнне для развіцця навукі і паслядоўных палётаў у космас.

Нашы сябры Юрый Гагарын і Герман Цітоў першымі пачалі разведку Сусвету, першымі пачалі асвойваць, так сказаць, касмічную цаліну. Цяпер пачаўся новы этап у асваенні космасу. Настаў час, калі савецкая навука, якая служыць справе міру і прагрэсу, збірае з касмічнай цаліны багаты ўраджай — узбагачаецца каштоўнымі данымі для новых найвялікшых адкрыццяў.

Цяжка перадаць, таварышы, як добра было ўдваіх у космасе, якое гэта радаснае пачуццё, якое я адчуў, калі выйшаў на арбіту і аказаўся побач са мной карабель «Усход-4», кіруемы маім касмічным братам Паўлам Паповічам. Сустрэча з сябрам заўсёды радуе, а сустрэча ў космасе асабліва моцна радуе. Як добра лятаць удваіх у касмічных прасторах! Калі адчуваеш локаць сябра, і на душы становіцца весялей, і справа спорыцца.

Карабель «Усход-3» чацвёра сутак быў для мяне родным домам, часцінкай нашай любімай Радзімы. Разам з Паўлам Паповічам мы радуемся таму, што ў космасе быў створан першы савецкі калектыў, першае савецкае зямляцтва. У палёце мы былі тысячамі ніцей звязаны з любімай Радзімай, а цёплы, сяброўскі ўдзел і падтрымка ўсяго савецкага народа, партыі і ўрада ўдзесяцяралі нашы сілы. Пралятаючы над сваёй краінай, над палямі і лясамі, над морамі і гарамі, я разумеў, што за палётам двух караблёў сочаць мільёны людзей, адчуваў іх моцныя абдымкі. І гэта ўсяляла ўпэўненасць у поспех палёту, натхняла нас.

Савецкія людзі ганарацца гіганцкімі поспехамі, дасягнутымі савецкімі вучонымі, інжынерамі, тэхнікамі, рабочымі, чый творчы геній і самаадданая праца дазваляюць заваёўваць усё новыя і новыя вышыні, усё глыбей і глыбей авалодваць таямніцамі прыроды. Яны стварылі цудоўныя касмічныя караблі, паслухмяныя волі чалавека. Гэтак жа, як і першыя касманаўты, мы ні на мінуту не сумняваліся ў паспяховым зыходзе палётаў. Нізкі зямны паклон і сардэчнае дзякуй вам, стваральнікі магутнай тэхнікі, ад нас, савецкіх лётчыкаў-касманаўтаў!

Дарагія сябры! Дазвольце мне выказаць самую сардэчную падзяку Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі, Савецкаму ўраду, Мікіту Сяргеевічу Хрушчову за тое, што яны выгадавалі і выхавалі вялікую і дружную сям'ю савецкіх лётчыкаў-касманаўтаў — верных сыноў нашай многанацыянальнай Радзімы.

Прывітальныя тэлеграмы Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, яго радыётэлефонная размова з Паўлам Паповічам і са мной усхвалявалі нас да глыбіні душы, яны памнажалі нашу энергію і ўмацоўвалі волю да перамогі.

Сардэчнае дзякуй Вам, Мікіта Сяргеевіч, за цёплыя, сардэчныя словы, за штодзённую ўвагу, якой акружаны мы, лётчыкі-касманаўты, на зямлі і ў космасе.

Я запэўніваю Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі, Савецкі ўрад, асабіста Вас, дарагі Мікіта Сяргеевіч, што ў славу Айчыны, у славу народа гатоў выканаць любое заданне партыі і ўрада.

Дарагія таварышы! Нашы магутныя касмічныя караблі служаць інтарэсам навукі, справе ўмацавання міру на зямлі. Наша планета надзвычай прыгожая. Яна і з касмічных вышынь выглядае цудоўна, і трэба зрабіць так, каб яна ніколі не стала арэнай спусташальных войнаў. Зямля павінна быць мірнай, квітнеючай планетай.

Велізарны творчы ўздым, выкліканы ў краіне гістарычным XXII з'ездам КПСС, і прынятая ім велічная Праграма пабудовы камунізма — гэта такі магутны паскаральнік прагрэсу, які дазваляе Савецкай дзяржаве атрымліваць адну перамогу за другой. Групавы палёт у космасе — яшчэ адзін яркі доказ перавагі сацыялізма над капіталізмам.

Наша Радзіма знаходзіцца ў росквіце сваіх творчых сіл. Савецкі народ цвёрдым і ўпэўненым поступам ідзе да светлай мэты — камунізма. І няма ў свеце сілы, здольнай спыніць трыумфальнае шэсце савецкіх людзей да новых поспехаў у камуністычным будаўніцтве.

Дарагія масквічы! Сардэчна дзякую вам за гэту незабыўную сустрэчу, наладжаную нам у Дзень Савецкага Паветранага Флоту. Радасна ўсведамляць, што і мы, савецкія касманаўты, уносім свой працоўны ўклад ва ўмацаванне магутнасці сацыялістычнай дзяржавы.

Няхай жыве і квітнее наша любімая і дарагая сацыялістычная Айчына!

Няхай жыве вялікі савецкі народ — будаўнік камунізма, нястомны барацьбіт за справу міру ва ўсім свеце!

Слава ў вяках Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і яе ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту на чале з Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым!



Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў вітае герояў.

# У ІНТАРЭСАХ ПРАГРЭСУ І МІРУ

## З прамовы М. С. Хрушчова

(Пачатак на 2-й стар.)

янняў лётчыкаў-касманаўтаў у час палёту. Паміж імі ажыццяўлялася непасрэдная, двухбаковая, устойлівая радыётэлевізійная сувязь. Кіруючы караблямі, касманаўты маглі каардынаваць свае дзеянні адзін з адным, абменьвацца інфармацыяй, параўноўваць вынікі сваіх назіранняў.

Таварышам Нікалаеву і Паповічу было таму весялей у космасе, чым іх папярэднікам Гагарыну і Цітову: яны маглі не толькі падтрымліваць сувязь з Зямлёй, але і размаўляць адзін з адным і бачыць адзін аднаго за работай. Яны, як вы ведаеце, далі нават нешта накшталт самадзейнага канцэрта для Сусвету, выканаўшы дуэтам песню з прыпевам, які вельмі падыходзіць да данага выпадку і, па-мойму, цалкам адпавядае нашым далейшым планам у космасе.

Я верю, друзья, караваны
ракет
Помчат нас вперед от
звезды до звезды,
На пыльных тропинках
далеких планет
Останутся наши следы!

Узгодненасць, калектыўнасць дзеянняў у касмічных палётах — акалічнасць надзвычай важная ў справе асваення Сусвету. Чым далей касмічныя караблі будуць адыходзіць у глыбіні сусветнай прасторы, тым, напэўна, больш яны павінны будуць узаемадзейнічаць з іншымі касмічнымі караблямі і прамежкавымі міжпланетнымі станцыямі і праз іх трымаць сувязь з Зямлёй. Іменна так уяўляў сабе шлях пранікнення ў космас бацька касманаўтыкі вялікі рускі вучоны Канстанцін Эдуардавіч Цыялкоўскі.

Дасягненні ў асваенні космасу, як і сам космас, — гэта здабытак усяго чалавецтва. Таму вынікі пазнання космасу павінны быць усеагульным дабром, здабыткам усіх людзей, якія жывуць на нашай выдатнай планеце Зямля.

Савецкі народ па праву ганарыцца тым, што першы ў свеце групавы палёт у космас здзейснен яго гераічнымі сынамі — маёрам Андрыянам Рыгоравічам Нікалаевым і падпалкоўнікам Паўлам Раманавічам Паповічам. У гэтым палёце яны абодва паказалі сябе дастойнымі грамадзянамі нашай вялікай Радзімы, сапраўднымі камуністамі і праявілі высокую мужнасць і гераізм у выкананні задання партыі і ўрада.

Касмічны карабель-спадарожнік «Усход-3», кіруемы Андрыянам Нікалаевым, знаходзіўся ў палёце 95 гадзін, гэта значыць амаль чацвёра сутак. За гэты час ён аперазаў зямны шар больш як 64 разы і прайшоў адлегласць больш чым 2 мільёны 600 тысяч кіламетраў.

Касмічны карабель-спадарожнік «Усход-4», пілатуемы Паўлам Паповічам, за 71 гадзіну абляцеў вакол нашай планеты больш як 48 разоў і пераадолеў адлегласць каля 2 мільёнаў кіламетраў.

Мне дастаўляе велізарную радасць прывітаць сёння нашых герояў на трыбуне Маўзалея Уладзіміра Ільіча Леніна. Ад імя Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савецкага ўрада, усяго нашага гераічнага народа горача віншую вас, дарагі Андрыян Рыгоравіч, і вас, дарагі Павел Раманавіч, з выдатнай перамогай у космасе і выказваю вам самую сардэчную падзяку за подзвіг, які праславіў нашу любімую Радзіму і вас асабіста на вечныя часы.

Рад паведаміць, што за ажыццяўленне першага ў свеце шматдзённага групавога палёту ў космас на караблях-спадарожніках «Усход-3» і «Усход-4» Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў Андрыяну Рыгоравічу Нікалаеву і Паўлу Раманавічу Паповічу званне Герояў Савецкага Саюза. Ад усяго сэрца віншую вас з высокай узнагародай.

Павіншаваўшы родных касманаўтаў, рабочых, вучоных, якія стварылі касмічныя караблі, М. С. Хрушчоў сказаў:

Працай і толькі працай стварае чалавек усё цудоўнае на Зямлі і ў космасе. Працай савецкага чалавека ў нашай краіне пабудаван сацыялізм. Творчай працай мільёнаў савецкіх людзей узводзіцца велічны будынак камунізма. Сацыялізм і камунізм — вось той надзейны касмадром, з якога чалавецтва штурмуе і будзе штурмаваць прасторы Сусвету.

Нашы новыя поспехі ў асваенні космасу маюць глыбока міралюбівы, сапраўды гуманістычны характар. І як бы ні набівалі руку буржуазныя пісакі, ім не ўдасца даказаць адваротнае.

Пры сучасным развіцці навукі і тэхнікі ўсе народы могуць быць шчаслівымі, могуць жыць у міры і быць забяспечанымі. Для гэтага трэба перш за ўсё захаваць і ўмацаваць мір на зямлі. Мы лічым, што пераход на сацыялістычныя асновы грамадскага жыцця быў бы самым найвялікшым шчасцем для ўсіх народаў нашай планеты. Але пытанні грамадскага ладу вырашаюцца кожным народам — самастойна.

У захаванні і ўмацаванні міру маюць патрэбу народы ўсіх дзяржаў, незалежна ад іх сацыяльна-палітычнага ладу. Мірнае суіснаванне, захаванне і ўмацаванне міру прынясуць народам вялікія даброты. Намаганні народаў будуць ісці не на стварэнне сродкаў разбурэння, а на развіццё эканомікі, на стварэнне сродкаў вытворчасці. Нельга дапускаць, каб і далей велізарныя намаганні людзей і каласальныя расходы ішлі на стварэнне сродкаў знішчэння, сродкаў разбурэння, на знішчэнне людзей — стваральнікаў усіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Мы цвёрда стаім і будзем стаяць за мір, накіроўваючы нашы сродкі і сілы на мірнае стварэнне, на забеспячэнне бяспекі народаў, на ўздым жыццёвага ўзроўню працоўных.

Спыніўшыся на пытаннях забеспячэння міру, Мікіта Сяргеевіч падкрэсліў, што ніякая сіла, ніякія намаганні рэакцыі не могуць вярнуць былых часоў непадзельнага панавання капіталу.

Заканчваючы сваю прамову, М. С. Хрушчоў сказаў:

Новая перамога Савецкага Саюза ў асваенні космасу выклікала захапленне ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. У адрас Савецкага ўрада, у Цэнтральны Камітэт нашай партыі, у адрас слаўных касманаўтаў паступаюць тысячы і тысячы прывітальных пасланняў. Ад імя Савецкага ўрада і Цэнтральнага Камітэта партыі дазвольце выказаць падзяку ўсім дзяржаўным і грамадскім дзеячам, брацкім партыям і грамадскім арганізацыям, дзеячам навукі, усім, хто прыслаў віншаванні ў сувязі з палётам у космас караблёў «Усход-3» і «Усход-4», і ўсім тым хто не прыслаў прывітання, але разам з намі радуецца гэтай падзеі.



Лётчыкі-касманаўты А. Р. Нікалаеў (злева) і П. Р. Паповіч у Крамлі.

# ГРАНДЫЁЗНАЯ ПАДЗЕЯ

Чвэрць стагоддзя таму назад народы свету былі сведкамі падзеі грандыёзнага значэння. Тры савецкія адважныя сокалы-героі В. Чкалаў, Г. Гайдукоў і А. Белякоў на пабудаваным савецкімі людзьмі вялікім паветраным караблі першымі праклалі транспалярную паветраную трасу з сэрца Савецкага Саюза — Масквы ў Злучаныя Штаты Паўночнай Амерыкі.

Тады гэтая падзея лічылася грандыёзнай і ўсе народы свету віншавалі і віталі савецкіх лётчыкаў-герояў і краіну, якая выхавала такіх адважных людзей.

Мне, як былому эмігранту, які раней жыў у ЗША, давялося быць сведкам і ўдзельнікам і ў некаторай ступені арганізатарам ушаноўвання савецкіх герояў.

Тады побач з афіцыяльнай Амерыкай у прывітанні савецкіх герояў прынялі ўдзел дзесяткі тысяч расійскіх эмігрантаў, якія жылі ў ЗША.

Сягоння, праз дваццаць пяць год, новыя, да гэтага часу небывалыя цуды. На мінулым тыдні два савецкія лётчыкі-касманаўты Андрыян Рыгоравіч Нікалаеў і Павел Раманавіч Паповіч на караблях «Усход-3» і «Усход-4», узняўшыся ў космас, кружылі вакол нашай планеты. З казачнай вышыні яны назіралі ўсё хараство нашай планеты, перадавалі ад свайго імя і ад імя сваёй Радзімы прывітанне ўсім народам свету, заклікалі да барацьбы за мір супраць вайны.

Знаходзячыся ў космасе, савецкія касманаўты ўвесь час гаварылі не толькі з зямлёй, але і вялі размовы паміж сабой і бачылі адзін аднаго ў космасе. Выканаўшы зададзеную праграму, абодва касманаўты 15 жніўня ў зададзеным раёне шчасліва зрабілі пасадку. Аб гэтым выдатным подзвігу, аб дасягненні савецкіх вучоных, інжынераў, тэхнікаў і рабочых сягоння гавораць ва ўсім свеце, яго вітаюць усе народы свету.

Хочацца верыць, што суайчыннікі на чужыне, у тым ліку мае старыя сябры і знаёмыя, што жывуць у ЗША, разам з усімі народамі свету ганарацца грандыёзнымі дасягненнямі сваёй Савецкай Радзімы.

**Данііл Васільевіч КАЗУШЧЫК.**

# ШЧЫРА ВІНШУЕМ, ГАНАРЫМСЯ!




**У сувязі з велічнай падзеяй — палётам у космас Андрыяна Нікалаева і Паўла Паповіча — нашы суайчыннікі з-за мяжы прыслалі ў рэдакцыю шмат пісьмаў. У іх выказваецца шчырая любоў да Бацькаўшчыны, гордасць і захапленне поспехамі савецкага народа.**

**Ніжэй друкуем некаторыя з гэтых пісьмаў.**

## БЯЗМЕЖНА РАДЫ

*Дарагія таварышы!*

*Бязмежна рады новаму поспеху савецкай навукі ў асваенні касмічнай прасторы.*

*Слава Нікалаеву і Паповічу!*

*Слава Радзіме і яе народу-стваральніку!*

*Я. ЦІШКОЎ.*

Англія.

## Амерыка засталася ззаду

У сувязі з запускам у космас «Усходу-3» і «Усходу-4» віншую ўвесь вялікі савецкі народ і вас, паважаныя землякі з Камітэта за вяртанне на Радзіму і развіццё культурных сувязей з суайчыннікамі і рэдакцыі газеты «Голас Радзімы», з вялікім поспехам і дасягненнем савецкай навукі і тэхнікі і жадаю, каб развіццё навукі і тэхнікі ў СССР ішло і надалей гіганцкімі крокамі. Каб цяпер капіталістычны Захад меў сваім лозунгам: «Дагнаць сацыялістычны Усход».

Развіццё сацыялістычнага Усходу ідзе такімі гіганцкімі крокамі, што капіталістычнаму свету ніколі і не снілася. Такіх дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі, якіх у СССР дасягнулі за 45 год, гэта значыць за час, калі сам працоўны народ кіруе краінай, капіталістычныя краіны не здольны дасягнуць за 450 год. Прычым, пасля другой сусветнай вайны, як і пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, народу дасталася спаленая зямля — папялішчы. Аднак працоўны народ, безумоўна, не без цяжкасцей, адбудаваў сваю народную гаспадарку, а навуку і тэхніку узняў на найвышэйшы ўзровень у свеце.

Пасля гістарычнага запуску двух касманаўтаў, гэта значыць «Усходу-3» і «Усходу-4», увесь свет на чале з амерыканскімі вучонымі згаджаецца без спрэчак, што нават найбольш развітая капіталістычная краіна, як Амерыка, засталася ззаду ад СССР сама менш на два гады.

Вучоныя ўсяго свету глядзяць цвяроза і з розумам. У вачах вучоных усяго свету савецкія вучоныя стаяць на найвышэйшым узроўні.

Памятаю гады два таму назад на канферэнцыі ў Жэневе вучоных па атамных праблемах меў месца такі факт. Вучоныя ўсяго свету былі на канферэнцыі. Ад кожнай дзяржавы — група вучоных. Дэлегацыі краін праходзілі ў залу. Ніякага асаблівага ўражання не зрабіла нават з'яўленне амерыканскай дэлегацыі ў зале. Але, нарэшце, уваходзіць дэлегацыя вучоных Саюза ССР, якая прадстаўляе сабой дзяржаву, дзе працоўны народ кіруе краінай, дзе навука і тэхніка за гэты час узняліся на найвышэйшы ўзровень у свеце. І раптам усе вучоныя свету, як па камандзе, усталі і бурнымі апладысментамі спаткалі савецкую дэлегацыю. Гэты факт гаворыць аб тым, якой павагай карыстаюцца савецкія вучоныя — прадстаўнікі працоўнага народа.

Апошняя падзея — палёт двух касманаўтаў — напаўняе гонарам сэрца кожнага сумленнага працоўнага чалавека зямнога шара.

Гонар і слава адважным касманаўтам!

І. С.

ЗША.

## ГЭТА ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА

*Добры дзень, паважаныя рэдакцыя газеты «Голас Радзімы» і радыё!*

*Прыміце ад мяне, а таксама ад усіх дзяцей, якія правялі свой адпачынак у піянерскім лагеры «Крыжоўка», гарачае сардэчнае прывітанне.*

*Канцэрт, які вы запісалі на магнітафонную плёнку і падарылі нам, таварышы ў Бельгіі праслухалі з задавальненнем. Усім ён вельмі спадабаўся.*

*Дарагія таварышы! Віншуем вас з вялікай перамогай савецкага народа: палётам у космас адважных лётчыкаў-касманаўтаў Нікалаева і Паповіча. Мы ганарымся сваёй Радзімай, радуемся за яе, жадаем ёй яшчэ большых поспехаў.*

*З сяброўскім прывітаннем*

*В. П. СУЧКОВА.*

Бельгія.

# По гарадах і вёсках Беларусі

## Весткі з Гомельшчыны

# Прыгожа жывуць у Яроміне

Пакрыўленыя хаткі са сляпымі акенцамі і саламянымі дахамі. Царква, дабротны дом кулака. Па вуліцы ў брычцы, запрэжанай сытай тройкай, едзе мясцовы памешчык. Побач са сваёй панурай клячай ідзе селянін у палатнянай вопратцы. На калёсах — мяшок са збожжам: гэта, відаць, усё, што зарабіў батрак за месяц паднявольнай працы. Па размытай дажджом дарозе пляцецца жабрак з павадыром...

Так самадзейны мастак Аляксандр Каламейцаў расказаў аб жыцці яромінскіх сялян да Вялікага Кастрычніка. Карціна яго так і называецца — «Яроміна да рэвалюцыі».

Непазнавальна змянілася жыццё працаўнікоў вёскі за гады Савецкай улады. Асабліва многа змен адбылося за апошнія гады. Цяпер Яроміна — цэнтр буйнага, шматгаліннага калгаса імя XXII з'езда КПСС. Высокімі ўраджаямі, багатым выхадам жывёлагадоўчай прадукцыі славіцца сельгасарцель. Няспынна павялічваюцца яе даходы. Летась даход калгаса перавысіў 620 тысяч рублёў.

Рост эканомікі арцелі — вось тая аснова, на якой павышаецца матэрыяльны дабрабыт хлебаробаў, іх культурны ўзровень. Бойка ідзе гандаль у двух сельскіх магазінах. Хлебаробы купляюць адзенне, мэблю, культтавары.

— Днямі зноў прадалі тэлевізар, — расказвае работніца прамтаварнага магазіна Ганна Буцько. — Трактарыст Васіль Кароўкін купіў...

Цяпер над многімі дамамі ўзвышаюцца тэлевізійныя антэны. У асабістым карыстанні яромінцаў — больш 50 апаратаў з блакітнымі экранамі. А прыёмнікі і радыёлы ледзь не ў кожным доме.

Аб росце культуры хлебаробаў яскрава сведчаць і такія лічбы. Жыхары Яроміна і суседняга пасёлка Высокі выпісваюць 2256 экземпляраў газет і часопісаў. У кожны дом паштальёны прыносяць па некалькі назваў перыядычных выданняў.

А кнігі? Яны даўно сталі неразлучнымі спадарожнікамі хлебаробаў. Многія калгаснікі маюць асабістыя біблятэчкі. Да паслуг працаўнікоў вёскі — клубная бібліятэка. Тут багаты выбар мастацкай літаратуры, а таксама кніг па розных галінах ведаў. Асабліва частыя наведвальнікі бібліятэкі — студэнты. Дзесяткі жыхароў вёскі паспяхова займаюцца ў вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах краіны, сумяшчаючы вучобу з плённай працай у родным калгасе. Ветэрынарны фельчар Канстанцін Ваявода — студэнт-завочнік Маскоўскай ветэрынарнай акадэміі, учотчыца чацвёртай брыгады Зінаіда Гаўрыленка вучыцца без адрыву ад вытворчасці ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Хутка праляцяць гады вучобы, і завочнікі папоўняць рады дыпламаваных калгасных спецыялістаў, узначаляць брыгады і фермы. Цяпер у калгасе 13 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй сельскагаспадарчай адукацыяй. А колькі ў Яроміне спецыялістаў іншых прафесій! У адной сярэдняй школе, што размешчана на цэнтральнай сядзібе арцелі, працуюць 34 настаўнікі, большасць з якіх маюць вышэйшую педагагічную адукацыю.

Вечарамі вуліцы калгаснай вёскі заліты электрасвятлом. Змяніўшы рабочую вопратку на выхадныя касцюмы, хлебаробы спяшаюцца ў калгасны Дом культуры. Ён бачны, бадай, з усіх канцоў вёскі, гэты двухпавярховы прыгажун-палац. 450 чалавек могуць тут адначасова глядзець кінафільм і слухаць канцэрт. Кожны дзень у Доме культуры наладжваюцца цікавыя мерапрыемствы. Выступаюць аматары мастацкай самадзейнасці, даюць канцэрты, ставяць спектаклі артысты-прафесіяналы з Гомеля, Мінска. Нядаўна, напрыклад, калгаснікі праслухалі канцэрт у выкананні Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР.

...У калгасным агракабінеце вісіць вялікая карта. Надпіс на карце тлумачыць, што гэта — «Схема планіроўкі і забудовы калгаса імя XXII з'езда КПСС Гомельскага раёна». Умоўныя значкі схемы — гэта новыя жывёлагадоўчыя пабудовы, узведзеныя з улікам апошніх дасягненняў заатэхнікі і будаўнічай тэхнікі, новыя вуліцы калгаснай вёскі, новыя скверы і паркі... У перспектыўным плане забудовы калгаса, разлічаным на дваццаць год, прадугледжаны тыпавыя памяшканні універмага і гасцініцы, бальніцы і пякарні.

І. ДЗЕМІДЗЕНКА.



Уладзімір Асадчы і Генадзь Самусенка—перадавыя муляры. Свае зменныя заданні яны выконваюць на 115—120 працэнтаў.



Церахоўскі завод масла і сухога малака. Загадчык вытворчасці малака Буланы Віталій Аляксандравіч і лабарантка Любоў Мікалаеўна Філімонцава ля паточнай лініі.

# У РАБОЧАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

Закончыўся працоўны дзень. У прафсаюзным клубе Добрушскага цэлюлозна-папяровага камбіната «Герой працы» гасцінна адчыняюцца дзверы. Сетачнікі і рольшчыкі, каландроўшчыкі і сартавальшчыцы, інжынеры і тэхнікі — усе ахвотна ідуць сюды. Адны спяшаюцца на заняткі харавога і танцавальнага гурткоў, другія — паслухаць лекцыю або гутарку, абмяняць кнігу.

Паслугамі бібліятэкі карыстаюцца людзі розных узростаў і прафесій — усяго каля 1.500 чалавек. І кожнага з іх бібліятэкар Фаіна Ільінічна Бабушкіна сустракае ветліва, па-сяброўску, уважліва выслухоўвае. Для кожнага знаходзіцца ў яе цікавая кніга. Да паслуг чытачоў звыш пятнаццаці тысяч тамоў рознай літаратуры.

Чытальная зала бібліятэкі заліта яркім электрычным святлом. На сталах ляжаць свежыя газеты і часопісы. Паабапал мяккія крэслы і канапы. На сценах — фотавыстаўкі, рэкламныя плакаты, выстаўка навінак літаратуры.

З дапамогай бібліятэчнага савета Фаіна Ільінічна Бабушкіна часта арганізоўвае абмеркаванне лепшых твораў савецкай літаратуры, літаратурныя вечары, дзіцячыя ранішнікі.

А. КУРЛОВІЧ.

# УЗВОДЗЯЦЦА НОВЫЯ ДАМЫ

У гады Вялікай Айчыннай вайны гарадскі пасёлак Жыткавічы быў амаль поўнасцю зруйнаваны гітлераўскімі бандытамі.

З дапамогай дзяржавы гарадскі пасёлак адбудаваўся, вырас. Адноўлены прамысловыя прадпрыемствы: прамкамбінат, маслазавод, чыгуначная станцыя. Узнікла нямала новых бытавых і культурных будынкаў. Гэта хлебапякарня, лазня, камбінат бытавога абслугоўвання і іншыя. У мінулым годзе здадзены ў эксплуатацыю бальнічны гарадок і школа-адзінаццацігодка.

У гарадскім пасёлку працуюць дзве васьмігодкі, вячэрняя сярэдняя школа рабочай моладзі, музычная школа. Звыш 1500 дзяцей рабочых і служачых навучаецца ў Жыткавічах.

Ёсць дзе і адпачыць жыхарам пасёлка. Да іх паслуг — двухпавярховы раённы Дом культуры, раённая бібліятэка і дзіцячая бібліятэка з агульным кніжным фондам 31 тысяча экземпляраў кніг.

Ёсць у райцэнтры стадыён, дзе адбываюцца масавыя гульні, спартыўныя спаборніцтвы.

З кожным годам узводзяцца новыя жылыя дамы і грамадскія пабудовы. Толькі па вуліцы Карла Маркса за апошнія тры гады здадзена ў эксплуатацыю каля 10 васьмікватэрных дамоў. Два шматпавярховыя дамы яшчэ будуюцца. Заканчваецца ўзвядзенне раённай гасцініцы, закладзены падмуркі трохпавярховых будынкаў раённага універмага і шырокаэкраннага кінатэатра.

Н. ІВАНОЎ.

* * *

### АДПАЧЫВАЮЦЬ У ЗДРАЎНІЦАХ

Вялікія клопаты праяўляе праўленне калгаса «Новае жыццё» аб умацаванні здароўя хлебаробаў. Штогод за арцельныя сродкі многія з іх адпачываюць на курортах і ў санаторыях краіны. Сёлета пабывалі ўжо ў здраўніцах Каўказа і Прыбалтыкі звыш 20 чалавек. Сярод іх трактарыст Іван Матох, паляводы Сяргей Козел, Уладзімір Багай і іншыя.

### ПЕНСІІ САСТАРЭЛЫМ

267 састарэлых калгаснікаў і калгасніц штомесячна атрымліваюць грашовую пенсію. Толькі за першае паўгоддзе пенсіянерам выдадзена каля 7 тысяч рублёў.

### СПРАВІЛІ НАВАСЕЛЛІ

Кожны год хлебаробы спраўляюць наваселлі. Сёлета пабудавалі новыя дамы і справілі наваселле больш 10-ці калгасных сем'яў. Гэта члены сельгасарцелі Іван Дзедавец, Сцяпан Царык, Сямён Карась і іншыя.

Сям'ю калгасніцы Кацярыны Чорнай напаткала няшчасце — згарэў дом. Жанчыну не пакінулі ў бядзе. Праўленне бясплатна выдзеліла ёй лес, транспарт. І цяпер сям'я Чорнай жыве ў новым, прасторным доме. Апрача гэтага, ёй аказана грашовая дапамога.

### РАСЦЕ МАШЫННЫ ПАРК

З кожным годам багацее грамадская гаспадарка, растуць непадзельныя фонды. Гэта дазваляе калгасу значную суму грошай выдаткоўваць на набыццё тэхнікі.

Так, сёлета калгасам набыта два дызельныя трактары, самаходны зернекамбайн, тры грузавыя аўтамашыны, торфапагрузчык і іншая тэхніка.

І. НОВІКАЎ.

Гомельская вобл.
Жыткавіцкі раён.



Удзень і ўначы вядзецца будаўніцтва буйнаблочных жылых будынкаў у мікрараёне на Фестывальным пасёлку ў Гомелі. Да канца гэтага года тут будзе здадзена ў эксплуатацыю адзінаццаць 80-кватэрных жылых дамоў.

# РАДЫЁ

### ДЛЯ ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па сярэднееўрапейскаму часу на сярэдняй хвалі 227 метраў (ці 1322 кілагерцы) з 6 да 7 гадзін, з 16.00 да 17.00 і з 21.00 да 21.30;

на кароткай хвалі 30,83 метра (ці 9730 кілагерцаў) з 6 да 7 гадзін.

Па нядзелях — на хвалях 30,83 метра і 227 метраў з 8 да 9 гадзін і з 10 да 13 гадзін.

### НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па серадах—ад 21 гадзіны 30 мінут па Грынвічу, або ад 22 гадзін 30 мінут па сярэднееўрапейскаму часу на хвалі 31 метр (ці 9520 кілагерцаў) і на хвалі 41 метр (ці 7380 кілагерцаў);

па нядзелях—ад 7 гадзін раніцы па Грынвічу або ад 8 гадзін раніцы па сярэднееўрапейскаму часу на хвалях 30,83 метра і 227 метраў.

### ДЛЯ ЗША І КАНАДЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па нью-йоркскаму часу з 19.30 да 20.30 на хвалях:
31,04 метра (ці 9665 кілагерцаў),
31,23 метра (ці 9605 кілагерцаў),
41,15 метра (ці 7290 кілагерцаў).

### НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па суботах — ад 20 гадзін да 20 гадзін 30 мінут па нью-йоркскаму часу на кароткіх хвалях:
31,04 метра (ці 9665 кілагерцаў);
31,23 метра (ці 9605 кілагерцаў),
41,15 метра (ці 7290 кілагерцаў).


### НАШ АДРАС

Мінск, Ленінскі праспект, 77. Дом друку. Рэдакцыя газеты «Голас Радзімы».

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.